***А. Я. Паўлава,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыі і музеязнаўства*

# ВІНШАВАЛЬНЫЯ ПАШТОЎКІ ЯК АБ'ЕКТ МУЗЕЕФІКАЦЫІ

Адкрытыя лісты да нядаўняга часу суправаджалі чалавека паўсюль. Прымаючы да ўвагі велізарную колькасць выпушчаных паштовак і ў той жа час адсутнасць іншых спосабаў паведамлення, можна зрабіць выснову, што паштоўкі да канца XX ст. былі галоўным спосабам масавай камунікацыі.

Па адной з версій, першая віншавальная картка была створана ў 1840 г. у Лондане. Для таго, каб павіншаваць сваіх шматлікіх сваякоў з Калядамі, Генры Коўл, першы дырэктар музея Вікторыі і Альберта, заказаў паштоўкі, на якіх была намалявана вялікая сям'я за святочным сталом. У Расіі і Беларусі віншавальныя карткі з'явіліся ў канцы XIX ст., адна з найбольш ранніх створана ў 1892 г. , а правобразам такіх паштовак лічацца лубачныя карткі 1740-х гг. Першая велікодная віншавальная паштоўка Расійскай імперыі выпушчана ў 1897 г.

Папулярнасць і запатрабаванасць гэтага «атрыбуту сувязі» ў грамадстве былі звязаны з распаўсюджваннем пісьменнасці і адукацыі, ростам гарадскога насельніцтва. Таму феномен ілюстраваных паштовак склаўся і перажываў свой росквіт у рамках гарадской культуры. «Залатым часам» паштоўкі лічыцца канец XIX – пачатак XX ст. У навагодніх паштоўках пануе «рускі стыль» мастачкі Е. Бём. Менавіта ў гэты перыяд попыт на віншавальныя паштоўкі становіцца настолькі вялікім, што айчынныя прадпрыемствы не спраўляліся з заказамі. Па эскізах рускіх мастакоў паштоўкі пачалі выдаваць у Германіі, Швецыі, Францыі [3].

Віншавальныя паштоўкі як арыгінальны мастацкі жанр мелі свой твар. Іх сюжэты складаліся з сімволікі святаў і былі разлічаны на розныя густы і сацыяльныя слаі грамадства. Склаўся своеасаблівы канон: картка павінна быць высокамастацкай і ў той жа час простай, яркай і вясёлай, як само свята.

Трэба адзначыць, што ілюстраваныя карткі да афіцыйных святаў сумяшчаюць віншавальныя і ідэалагічныя задачы, таму на ніх заўсёды прысутнічаюць афіцыйныя і неафіцыйныя сім-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

валы краіны (паштоўкі да святаў вайскоўцаў і да Дня незалежнасці). У першыя два дзесяцігоддзі савецкай улады паштоўкі былі абвешчаны буржуазным перажыткам. З аднаўленнем у 1938 г. святкавання Новага года з'явіліся і першыя савецкія святочныя паштоўкі. Масавае выданне навагодніх картак пачалося напярэдадні 1942 г. у час бітвы за Маскву. Пасля 1953 г. перапіска з дапамогай віншавальных паштовак прыняла той характар, які яна насіла да кастрычніка 1917 г. Неабходна адзначыць як асаблівасць адсутнасць віншавальных паштовак да рэлігійных святаў. У такіх абставінах сімволіка велікодных паштовак часта перамяшчалася на паштоўкі, прысвечаныя Міжнароднаму жаночаму дню 8 Сакавіка, «З нованараджаным» ці «З Днём нараджэння!»

Найбольш любымымі сталі паштоўкі да Новага года і 8 сакавіка, як найменьш ідэалагізаваных святаў. Асабліва добрая заўсёды была навагодняя паштоўка: маляўнічая, рознасюжэтная, аздобленая выявамі атрыбутаў свята і зімы. Па малюнках становіцца зразумела, што Навагодняе свята цесна звязана з жыццём краіны і пераплецена з мультыплікацыяй таго часу: Дзед Мароз ляціць на ракеце, спяшаецца на БАМ, развозіць падарункі на санках, сустракаецца са звярамі [2].

Прадпрымаліся спробы падрыхтаваць віншавальныя паштоўкі да прафесійных святаў. Аднак, гэта пачынанне не атрымала працягу: адзіным выключэннем можна лічыць віншавальныя паштоўкі да Дня настаўніка. З’явіліся паштоўкі, прысвечаныя важнай для савецкіх сем'яў падзеі – уваходзінам [7, с. 5–15].

У апошняе дзесяцігоддзе XX ст. цікавасць да святочнай перапіскі стала падаць. З’явілася электронная паштоўка. Адначасова другое жыццё атрымала мастацтва стварэння самаробных паштовак, і паступова ў якасці ўкладыша ў падарунак вярнулася новая віншавальная паштоўка.

Ілюстраваная картка – гэта святочная, дакладней, віншавальная культуры. Поліфункцыянальнасць паштоўкі дазваляе па-новаму зірнуць на яе як перспектыўны аб’ект музейнага паказу. Варта адзначыць, што з пункту гледжання музеефікацыі паштоўкі ўяўляюць сабой па сутнасці ідэальны прадмет музейнага паказу, таму што адпавядаюць усім асноўным крытэрыям музейнага прадмету: інфармацыйнасці, экспрэсіўнасці і прывабнасці. Невыпадкова акадэмік Д. С. Ліхачоў адзначаў, што паштоўкі – гэта «візітныя карткі часу, здольныя ўмацаваць на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шу памяць, паглыбіць крыніцы нашай душы». З аднаго боку, паштоўка – прадмет камерны: чалавек выбірае сюжэт, надпісвае, атрымлівае патаемныя навіны, захоўвае паштоўку як каштоўнасць або выкідвае. У той жа час паштоўка – гэта своеасаблівая лакмусавая паперка грамадскіх настрояў і пераваг: разгледзім яе як паштовую картку – атрымаем гісторыю пошты, як паліграфічнае выданне – пабачым зрэз выдавецкай справы, погляд у маляваны сюжэт і афармленне – акунёмся ў гісторыю мастацтва дызайна і гісторыю штодзённасці [4].

На сённяшні дзень ні ў нашай краіне, ні ў іншых краінах свету няма музея, у якім бы мелася стацыянарная экспазіцыя, прысвечаная адкрытаму лісту, нягледзячы на тое, што практычна ў кожным музеі маюцца паштоўкі. Значныя зборы філакартыі знаходзяцца ў бібліятэчных і архіўных установах Беларусі. Калекцыя адкрытых лістоў у Нацыянальным гістарычным музеі РБ налічвае каля 9,5 тыс. адзінак захоўвання, калекцыя Нацыянальнай бібліятэкі – каля 21,5 тыс. адзінак захавання. Калекцыі паштовак маюцца таксама ў фондах Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, Полацкага музея беларускага кнігадрукавання, Дзіцячага музея ў Полацку, Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея і г. д. Захаваліся і зборы выдадзеных за мяжой беларускіх калядных паштовак: у зборы Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку і Беларускай бібліятэцы і музея імя Скарыны ў Лондане [1].

Экспазіцыйнае выкарыстанне паштоўкі грунтуецца на агульных уласцівасцях музейнага прадмета. Як сведчыць аналіз выставак, важнай асаблівасцю экспанавання паштовак айчыннымі музейнымі ўстановамі з'яўляецца той факт, што прыярытэт аддаецца менавіта паштоўкам з выглядамі гарадоў і віншавальным. Іх выкарыстанне ў экспазіцыі засноўваецца на інфармацыйным патэнцыяле і эмацыйным уздзеянні. Паштоўка з’яўляецца комплекснай крыніцай, што ўключае ў сябе якасці выяўленчай, пісьмовай, рэчыўнай і фанічнай крыніцы. Да выяўленчай крыніцы паштоўка ставіцца дзякуючы наяўнасці на асабовым боку ілюстраванай паштоўкі малюнка. Паштоўка можа мець пісьмовае паведамленне. У якасці рэчыўнай крыніцы паштоўку варта разглядаць як: прадмет паштовага допісу адмысловага выгляду, прадмет збіральніцтва, прадмет утылітарнага прызначэння [6, с. 63–74].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Патэнцыял паштоўкі дазваляе разглядаць яе ў музейнай прасторы як самастойны аб'ект музейнага паказу. У выставачнай прасторы паштоўку выстаўляюць звычайна ў шкляных рамах. У адну раму змяшчаюць да некалькіх дзясяткаў паштовак, нумаруюць іх, а інфармацыю выносяць у этыкетаж. Такім чынам, атрымліваецца перанасычаны ілюстрацыйны паказ і груваcткая этыкетка. У дадзеным выпадку губляецца камунікатыўны кантакт паміж музейным прадметам і наведвальнікам.

Аднак, паштоўка можа выступаць фонавым афармленнем. Прыёмы ўяўлення паштоўкі ў выставачнай прасторы як навукова-дапаможнага матэрыялу значна шырэй, чым як самастойнага музейнага прадмета. Так, на выставах, прысвечаных Новаму году і Калядам, копіямі паштовак як навагоднімі цацкамі ўпрыгожваюць штучныя елкі ці сцэны.

Для прэзентацыі паштоўкі ў экспазіцыі можна выкарыстоўваць ансамблевы ці вобразна-сюжэтны метады паказу з удзелам іншых музейных прадметаў, якія будуць выступаць у якасці дапаможнага матэрыялу. Часцей за ўсё пры экспанаванні паштоўкі звяртаюцца да сістэматычнага ці тэматычнага прынцыпу дэманстрацыі.

Віншавальныя паштоўкі валодаюць вялікім патэнцыялам з пункту гледжання культурна-адукацыйнай дзейнасці, што паспяхова даказалі створаныя у Санкт-Пецярбургу і ў в. Жырмуны Гродзенскай вобласці дзіцячыя музеі паштовак. У 2015 г. упершыню адбылася выстава-фестываль аўтарскай паштоўкі «Post scriptum», ініцыяваная дызайнерамі – мастакамі і супрацоўнікамі Музея гісторыі беларускага кіно. Падчас выставы праводзіліся майстар-класы па самаробнай паштоўцы. Сама выстава ўвесь час суправаджалася відэаінсталяцыяй «Паштоўка сваімі рукамі». У 2016 г. у філіяле НГМБ падчас акцыі «Ноч музеяў–2016» адбылася Post-ноч. Усё вышэй сказанае сведчыць пра шматгранны музейны патэнцыял віншавальных картак.

1. *Гордиенко, Н.* Белорусские рождественские открытки на Западе [Электронный ресурс] / Н. Гордиенко. – Режим доступа : www.nn.by/?c=ar&i=102360&lang=ru.html. – Дата доступа : 2.12.2016.

2. *Гужевая, Э.* Чудесные картинки / Э. Гужевая // Аргументы и факты. – 2014. – № 52. – С. 9.

3. *Комягина, О.* Белорусские рождественские открытки в XIX веке печатали в Германии / О. Комягина // Комсомольская правда в Беларуси. – 2014. – 24 дек. – С. 9.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Ларина, А. Н.* Визитные карточки времени [Электронный ресурс] / А. Н. Ларина // Мир музея. – 2015. – № 1. – Режим доступа : www.mirmus.ru/2015/2015-01/425-vizitny-kartochki-vremeni.html. – Дата доступа : 3.12.2016.

5. *Самбур, М. В.* Интерпретация открыток в выставочном пространстве [Электронный ресурс] / М. В. Самбур. – Режим доступа : www.gramota.net/372014/2-1/44. html. – Дата доступа : 5.12.2016.

6. *Самбур, М. В.* Открытка в контексте культуры: атрибуция, научное описание, экспонирование : дис. … канд. культурологии : 24.00.03 / М. В. Самбур. – М., 2014. – 126 с.

7. *Чапкина, М. Я.* Привет из столицы. Советская поздравительная открытка 1917–1991 годов / М. Я. Чапкина. – М. : Контакт-культура, 2013. – 256 с.

***С. А. Паўлава,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры менеджменту*
*інфармацыйна-дакументнай сферы*

## САЦЫЯЛЬНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ЯК АБ’ЕКТ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Пераход да рынкавых адносін ва ўсіх сферах жыццядзейнасці соцыуму, змены інфармацыйнага стану грамадства прывялі да вызначанай трансфармацыі зместу форм работы бібліятэк. Гэта адлюстравалася на ўсіх сферах іх функцыянавання: сацыяльнай, эканамічнай, прафесіянальнай. Узнікла неабходнасць ужывання новых тэхналогій засваення сацыяльнай і бібліятэчнай прасторы.

Сацыялагічныя даследаванні паказалі, што розным відам дзейнасці характэрны свае тэхналогіі. Разглядаюцца тэхналогіі эканамічныя, палітычныя, гуманітарныя, тэхнічныя, сацыяльныя, кіраўнічыя, педагагічныя, экалагічныя і інш. Кожны з гэтых відаў мае сваю спецыфіку і прастору. У бібліятэчнай сферы маюць месца ўсе віды тэхналогій. Сацыяльныя тэхналогіі ў бібліятэках выкарыстоўваюцца даўно, але ў якасці асобнага аб’екта іх дзейнасці вывучаліся недастаткова і фрагментарна. Роля і месца сацыяльных тэхналогій у структуры бібліятэчнай дзейнасці канцэптуальна не вызначаны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ